JESUS
316

# Хто такі Ісус?

**Хто такі Ісус?** Біблія дае нам адзіны праўдзівы адказ на гэтае пытанне. Апостал Павал піша: *“Усё Пісаньне натхнёнае Богам і карыснае дзеля навучаньня, дзеля дакараньня, дзеля выпраўленьня, дзеля дысцыплінаваньня”* (2 Цімафея 3:16). Боганатхнёная Біблія ад кнігі Быццё да Адкрыцця навучае, што Ісус з’яўляецца Богам з вечнасці ў мінулым да вечнасці ў будучыні. Біблія дэкларуе, што Ён *“ёсьць Альфа і Амэга, Пачатак і Канец, — кажа Госпад, — Які ёсьць, і Які быў, і Які прыходзіць, Усеўладны”* (Адкрыццё 1:8). Біблія апісвае Ісуса як Бога, Творцу, Вялікага Пастуха, Госпада, Божае Ягня, Валадара Валадароў, Караля Каралёў, Імануэля (Бог з намі), Збавіцеля, Першасвятара, Уваскрасенне і Жыццё.

**Ісус — Творца.** *“На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова. Яно было ў Бога спрадвеку Усё праз Яго сталася, і без Яго нічога не было з таго, што сталася. І Слова Целам сталася, і пасялілася між нас, поўнае ласкі і праўды, і мы бачылі славу Яго, славу, як Адзінароднага ў Айца”*, — вытрымкі з Эвангелля паводле Яна 1:1-14. *“Бо ў Ім створана ўсё, што ў небе і што на зямлі, бачнае і нябачнае: ці то пасады, ці то панаваньні, ці то начальствы, ці то ўлады, — усё праз Яго і для Яго створана”*, — вытрымкі з ліста да Калосцаў 1:16-17.

**Ісус з’яўляецца “Я Ёсць”.** Ісус, пасланнік Божы, звярнуўся да Майсея з палаючага куста ў 3 раздзеле кнігі Выхад (~1,450 да РХ) і ідэнтыфікаваў Сябе як вялікага *“Я Ёсць”*. У 8 раздзеле Эвангелля паводле Яна, Ісус адзначыў, што з’яўляецца вялікім “Я Ёсць”, Які існаваў раней за Абрагама (~2,100 да РХ) і раней за яўрэйскі народ. Яўрэі палічылі гэта за пасягненне на Боскую прыроду і пахапалі камяні, каб забіць Яго. Пазней Ісус заявіў, што *“Я і Айцец - адно”*, (Ян 10:30-31), а яўрэі зноў схапіліся за камяні.

**Ісус у Старым Запавеце.** Ніхто ніколі не бачыў Бога Айца, Ян 1:18, 6:46. Аднакш Бог ў вобразе даўцелаўлёнага Ісуса з’явіўся некалькім людзям у часы Старога Запавету, перад тым, як Ён нарадзіўся ў Бэтлееме. Ён з’явіўся нібыта Анёл Госпада да Агар у Быцці 16 і 21, Майсею ў Выхад 3, Гедэону ў Суддзях 6 і бацькам Самсона ў Суддзях 13. Ісус таксама з’яўляўся Абрагаму ў Быцці 18 і 28 ды Якубу ў Быцці 31 і 32. Ісус згадваецца як адна з асобаў Троіцы ў прарока Ісаі 48:12-19 (напісана каля 700 года да РХ).

**Ісус быў Адзіным прадказаным.** Больш за 300 прароцтваў, запісаных за сотні гадоў раней, апісваюць нараджэнне, жыццё і смерць Ісуса. Некаторыя з гэтых прароцтваў ў Псальме 22 даюць жудаснае апісанне Яго ўкрыжавання (напісана каля 1000 года да РХ, калі пакараннем было ўкаменаванне). Выкананне гэтага прароцтва мы знаходзім у Мацьвея 27.

**Ісус стаўся Богачалавекам.** Прарок Ісая прапракаваў: *“Бо Дзіця нарадзілася нам, Сын дадзены нам,”* (Ісая 9:6). Ісая указваў, што гэтае Дзіця будзе магутным Богам. Вечны Сын быў дадзены як нованароджанае дзіця ў Бэтлееме. Ісус існаваў перад тым, як нарадзіўся — ад вечнасці. Тытул “Сын Божы” апісвае Яго становішча, а не нараджэнне. Гэта не азначае, што Ён пачаў існаваць калі нарадзіўся ў Бэтлееме. Апостал Павал піша: *“Бо няхай тое ў вас думаецца, што і ў Хрысьце Ісусе, Які, маючы постаць Бога, не лічыў захопам быць роўным Богу, але прынізіў Сябе, прыняўшы постаць слугі, стаўшыся на падабенства людзей і знойдзены выглядам, як чалавек, панізіў Сябе, стаўшыся паслухмяным ажно да сьмерці, і сьмерці крыжовай,”* (Піліпянаў 2:5-8). Ісус стаўся сапраўдным чалавекам застаючыся ісцінным Богам. Вечны Ісус прыйшоў на зямлю з Нябёсаў каб стацца чалавекам, Ян 3:13, 31, Ян 6:33-38. Ісус быў аднаачасова Богам і чалавекам.

**Ісус здзяйсняў цуды.** Многія Ягоныя цуды можна знайсці на старонках Новага Запавету. Тры з іх драматычна суправаджалі Яго важныя заявы. Ён цудоўным чынам нагадаваў 5,000 і потым сказаў: *“Я ёсьць хлеб жыцьця,”* (Ян 6:35). Ён ацаліў сляпога чалавека і пасля сказаў: *“Пакуль Я ў сьвеце, Я — сьвятло сьвету”*, (Ян 9:1-8). І Ён сказаў: *“Я ёсьць уваскрасеньне і жыцьцё. Хто верыць у Мяне, хоць і памрэ, жыць будзе,”* (Ян 11:25). Потым Ісус пайшоў да труны Свайго сябра Лазара, які памёр чатыры дні таму і ўваскрасіў яго зноў да жыцця. Ісус ацаляў хворых, нямоглых, глухіх, нямых, пракажоных і апанаваных. Ён пераўтвараў ваду ў віно, хадзіў па вадзе і супакойваў мора. Мацьвей 9:2-7 распавядае пра чалавека, які прынёс спараліжаванага да Ісуса.

Ён сказаў чалавеку: *”Будзь пэўным, дзіця! Адпускаюцца табе грахі твае”*. Рэлігійныя лідары палічылі гэта за блюзьнерства, бо толькі Бог можа дараваць грахі. Ісус спытаў іх: *“Бо што лягчэй сказаць: “Адпускаюцца табе грахі”, ці сказаць: “Устань і хадзі”? Але, каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі», — кажа тады спараліжаванаму: “Устань, вазьмі ложак твой і ідзі ў дом твой”. І, устаўшы, ён пайшоў у дом свой.”*

**Ісус падцвердзіў, што Ён зьяўляецца Богам.** Ісус выканаў старазапаветныя прароцтвы пра Яго нараджэнне, жыццё і смерць. Ён здзейсніў шмат цудаў і прадэманстраваў, што Ён — Бог. Ён навучаў з уладай: *“І сталася, калі Ісус скончыў гэтыя словы, натоўпы дзівіліся з вучэньня Ягонага, бо Ён вучыў іх, як той, хто мае ўладу, і не як кніжнікі”* (Мацьвей 7:28-29). І Ён жыў бязгрэшна — Яўрэям 4:15, 1 Пётры 2:22, 1 Яна 3:5. Ісус з’яўляецца бязгрэшным Богачалавекам, Ён стаўся дасканалым Божым Ягняткам, прынесеным у ахвяру на крыжы за нашыя грахі. *“Ён грахі нашыя Сам узьнёс у целе Сваім на дрэва, каб мы, памёршы дзеля грахоў, жылі ў праведнасьці”* (1 Пётры 2:24).

**Ісус быў укрыжаваны і ўваскрос з мёртвых.** *“Ведаючы, што не зьнішчальным срэбрам ці золатам выбаўлены вы ад марнага ладу жыцьця, перададзенага ад бацькоў, але каштоўнай крывёю Хрыста, як Ягняці беззаганнага і неапаганенага,”* (1 Пётры 1:18-19). *“І забілі Яго, павесіўшы на дрэве. Яго Бог уваскрасіў на трэці дзень, і даў Яму аб’яўляцца Пра Яго ўсе прарокі сьведчаць, што ўсякі, хто верыць у Яго, атрымае адпушчэньне грахоў праз імя Ягонае”*, (Дзеі 10:39-40, 43). *“Бо я найперш перадаў вам тое, што і сам прыняў, што Хрыстос памёр за грахі нашыя паводле Пісаньняў, і што Ён быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісаньняў,”* (1 да Карынцянаў 15: 3-4). Ісус уваскрос з труны і з’явіўся пры шматлікіх сведках перад тым, як зноў узнёсся на Нябёсы.

**Ісус — гэта адзіны шлях да Бога.** Ісус сказаў: *“Я ёсьць шлях, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, калі не праз Мяне,”* (Ян 14:6). Апостал Пётра сказаў: *“і ні ў кім іншым няма збаўленьня, бо няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у якім мусілі мы быць збаўленыя,”* (Дзеі Апосталаў 4:12). Апостал Павал напісаў: *“Бо адзін Бог і адзін Пасярэднік паміж Богам і людзьмі — Чалавек Хрыстос Ісус,[6] Які аддаў Сябе на адкупленьне за ўсіх, як сьведчаньне ў свой час”* (1 да Цімафея 2:5-6). Ісусавы шлях да Бога адрозьніваецца ад таго, што прапануюць іншыя рэлігіі. Яны не прапануюць вырашэнне праблемы нашага граха. У асноўным, яны навучаюць, што калі ты будзеш рабіць добрыя справы, адпаведныя іх дэфеніцыям добрага і злога, тады іхнія богі не будуць звяртаць увагу на грахі і прапусцяць чалавека да раю. Шлях Ісуса палягае ў тым, што праз веру ў Яго за вашыя грахі заплочана на крыжы і яны прабачаныя. З Ісусам вы ідзеце ў Нябёсы прабачаныя. *“Бо так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго Адзінароднага аддаў, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае”* (Ян 3:16).

**Ісус вернецца зноў.** Ісус сказаў: *“Няхай не трывожыцца сэрца вашае. Верце ў Бога і верце ў Мяне. 2 У доме Айца Майго жытла шмат, бо калі б гэтак не было, Я сказаў бы вам, бо іду падрыхтаваць вам месца. 3 І, калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду ізноў, і вазьму вас да Сябе, каб і вы былі, дзе Я,”* (Ян 14:1-3). У апошніх словах Біблii Ісус сказаў: “Так, прыходжу хутка!” Апостал Ян дадаў: *“Амэн. Так, прыйдзі, Госпадзе Ісусе!”* (Адкрыццё 22:20-21). Калі Ісус прыйдзе сёння, ці вы будзеце гатовыя Яго сустрэць? Наведайце сайт www.Gospel316.org каб быць ўпэўненым, што вы гатовыя, бо верыце ў Ісуса і вы прабачаны Богам.

**Ісус з’яўляецца Богам з вечнасці ў мінулым да вечнасці ў будучыні.**

**Захапіцеся ў неймаверным трымценні пры згадванні Ягонага імені.**

---

*Хто такі Ісус?* © 2025 Джон Д. Морыс III прадстаўлена “Acts One Eight”. Вы можаце друкаваць, капіяваць, дасылаць і распаўсюджваць яго змест нязменным уключна з гэтым палажэннем. Вы можаце дадаць лагатып і назву вашай царквы ці служэння на вяршыні старонкі, а таксама дадаць кантактную інфармацыю ўнізе другой старонкі. Jesus 316 базуецца выключна на Бібліі. Праэкт існуе каб дапамагчы людзям прыйсці да веры ў Ісуса Хрыста, потым расці каб быць Яго вучнямі. Вы можаце напісаць да Acts One Eight (па-магчымасці па-ангельску) на адрэсу Hello@Matt316.org. Праца па перакладзе на іншыя мовы з ангельскай была ажыцяўлена www.ChristianLingua.com.  “Хто такі Ісус?” дасяжна бясплатна на 48 мовах на сайце www.Jesus316.org. Біблейскія цытаты ў англамоўнай версіі прыведзеныя ў адпаведнасці з The Lockman Foundation’s New American Standard Bible 1995. Біблейскія цытаты ў гэтым перакладзе прыведзены ў адпаведнасці з выдання “Біблія. Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету. Пераклад Антонія Бокуна. 2023.”